7. *Чурко, Ю. М.* Белорусский хореографический фольклор: традиции и современность / Ю. М. Чурко ; науч. ред. С. В. Гутковская. – Минск : Четыре четверти, 2016. – 385 [1] с., [4] л. ил. : ил., схемы, нотные ил.

8. *Шамак, А. А.* Міфалогія беларусаў / А. А. Шамак. – Мінск : Ін-т культуры Беларусі, 2013. – 256 с.

# МАЛАЯ РАДЗІМА: КРЫНІЦЫ НАДХНЕННЯ Ў ТВОРЧАСЦІ

***Ю. А. Лукашэвіч,***
*аспірант кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вобраз малой радзімы ва ўсе часы знаходзіў шырокае адлюстраванне ў народнай творчасці і ва ўсіх відах мастацтва. Менавіта словы «малая радзіма» змяшчаюць глыбінны сэнс, які ўбірае ў сябе пачуцці і асацыяцыі, звязаныя з месцам нараджэння кожнага з нас, дзяцінствам, бацькамі, домам, дарагімі і блізкімі людзьмі. І нават праз гады, дзе б мы не знаходзіліся, кім бы не з’яўляліся ў іерархічнай лесвіцы соцыуму, родны ачаг настальгічна нас вабіць, нібыта кліча на сустрэчу з мінулым, незваротна адыходзячым у імклівым патоку часу. І натуральна многія літаратары, сцэнарысты і мастакі беражліва праносяць праз сваю, асобасную творчасць вялікую і невычэрпную тэму вялікай або малой радзімы, вельмі важную для кожнага чалавека.

У Гарадоцкім раёне на Віцебшчыне ёсць невялікая вёсачка Астраўляны. Яна прытулілася на паўднёвым беразе маляўнічага Вялікага Астраўлянскага возера. Яно мае востраў, на якім, па паданні, пахавана прыгажуня Ляна, таму вёска і атрымала такую назву. На прыканцы XX ст. Астраўляны былі вялікім пасяленнем з культурным цэнтрам Гарадокшчыны, дзе часта праводзіліся канцэрты і ладзіліся сустрэчы

з творчымі людзьмі, была школа і магазіны. Але даўно няма школы, клуба, не застаецца сёння ў вёсцы і моладзь.

Маляўнічыя пейзажы ваколіц Астраўлян не пакідаюць нікога абыякавымі. Варта толькі хоць адзіны раз пабачыць захад сонца на люстэркавай паверхні Малога ці Вялікага Астраўлянскага возера, бабровую хацінку, чаек, якія лунаюць над востравам, велічэзную французкую гару (жыхары вёскі сцвярджаюць, што высокі курган насыпалі французы, а ў яго недрах схаваны скарб Напалеона), як хочацца ўзяцца за пэнздлі ці фотаапарат і адлюстраваць гэту прыгажосць.

Так сталася, што Астраўляны лічацца маёй малой радзімай. Тут з’явіліся на свет і жылі мае прапрадзед, прадзед, дзед. Нарадзілася мая маці, якая вучылася ў мясцовай школе.

У гісторыі сям’і маёй маці ёсць цікавы факт. Яе прадед, Шкуратаў Гаўрыла Раманавіч, быў сябрам аўтара знакамітай паэмы «Тарас на Парнасе» Канстанціна Васільевіча Вераніцына. Гэта паэма доўгі час лічылася народнай, а ў сям’і Шкуратавых з удзячнасцю распавядалі сваім нашчадкам аб сяброўстве панскага сына з простым вясковым хлопцам. Гаўрыла Раманавіч быў адметным партным, працаваў пры панскім двары: шыў для пана Бондара і яго сваякоў авечыя тулупы і шыкоўныя шубы са скур ваўкоў і лісіц. Пры якіх абставінах Астраўлянская зямля аб’яднала двух таленавітых людей дакладна невядома. Аб сяброўскіх адносінах маладых людзей сведчыць той факт, што Канстанцін Вераніцын навучыў майго прапрадзеда грамаце. Гаўрыла Раманавіч быў адзіным у акрузе селянінам, які ўмеў чытаць і пісаць.

Маё жыццё цесна звязана з Астраўлянамі. У дзяцінстве кожнае лета мне даводзілася праводзіць менавіта тут, на маёй малой радзіме. Малявала астраўлянскія пейзажы, рабіла партрэты пажылых вяскоўцаў, сваіх аднагодкаў і ўсіх тых, хто пагаджаўся пазіраваць, з цікавасцю разглядала рэчы з бабулінага куфра, якія зрабіў мой прадзед для прабабкі ў першай палове XX ст. Зараз гэты куфар заняў пачэснае месца ля



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каміна ў інтэр’еры гасцёўні дома маіх бабулі і дзядулі, вясковых настаўнікаў у мінулым. Калі ўпершыню мне дазволілі адкрыць куфар, колькі ж у ім было для мяне незнаёмых і дзівосных рэчаў! Здзіўлялася таму, што маці беражліва і асцярожна дастае з яго нейкую шпульку ад верацяна (калаўрота), дзве старыя лыжкі з дрэва з немудрагелістым разным дэкорам, надтрэснуты драўляны коўш, вышываныя ручнікі (набожнікі), кашулю з вышыўкай на рукавах, вязаныя кручком і пруткамі сурвэткі і посцілкі. Пазней я даведалася, для чаго выкарыстоўваліся некаторыя рэчы, аб гісторыі кожнай з іх і што яны зроблены рукамі маіх продкаў. Калі разглядаю вышыўку сваёй прабабулі, разумею, наколькі таленавітай яна была, і мне, чалавеку з вышэйшай мастацкай адукацыяй, ёсць чаму павучыцца.

Я вельмі ўдзячна лёсу, што магу дакрануцца да рэчаў, якім больш за стагоддзе, ганаруся таленавітымі продкамі, іх майстэрствам і творчымі дасягненнямі. Гэта ж сапраўднае народнае мастацтва. Менавіта народнае мастацтва грунтуецца на гістарычнай памяці і пераемнасці традыцый, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, генетычнай сувязі духоўнага пачатку і рэальнасцяў быцця, прыроды і чалавека, чалавека і прадметнага свету. Прадстаўляючы духоўную цэласнасць у грамадстве, народнае мастацтва захоўвае ў сабе не толькі выпрацаваныя нашымі папярэднікамі традыцыі, але і акумулюе праявы сучаснага эстэтычнага, змястоўнага, вобразна-пластычнага мастацкага асэнсавання рэальнасці. Важнай асаблівасцю народнага мастацтва з'яўляецца тое, што са змяненнем аб'ектыўных жыццёвых рэалій яно захоўвае такія пастаянныя катэгорыі, як прыроднасць, гістарычнасць мастацкай свядомасці, глыбіню тэматыкі, сувязь матэрыяльнага і духоўнага.

Калі вярнуцца да канкрэтных вырабаў маёй бабулі, то заўважаеш, што яны маюць мастацкія якасці і створаны па законах кампазіцыі: паўтор і чаргаванне выяўленчых маты-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваў (мал. 1; 2); сувязь дэкору з формай рэчы, якая ўпрыгожваецца; колер выбраны з улікам мясцовых традыцый. Аб высокім мастацкім гусце сведчыць і вышыўка гладдзю (мал. 3). Тут выяўленчыя матывы стылізаваны, ёсць спроба іх арыгінальнага пластычнага і колеравага вырашэння. Можна прыкмеціць, наколькі дасканала простая сялянская жанчына валодала тэхнікамі вышыўкі крыжыкам, рышэлье (шыўкі роўныя, аднолькавай даўжыні, без перакосаў, апраўданы і падбор колеру нітак) (мал. 4). Узнікае пытанне: «Ад каго і ў чым чэрпала бабуля надхненне? Што надавала ёй, шматдзетнай маці, сілы аздабляць сваю хату прыгожымі рэчамі, якія яна стварала па вечарах пры газавай лямпе?» Можна знайсці толькі адзіны адказ: надхненне і сілы чэрпаліся з асяроддзя, ад людзей, якія жылі побач, з астраўлянскіх краявідаў, ад жадання атуліць сваіх дзяцей і сваякоў пяшчотай, так неабходнай у простым сялянскім жыцці і быце.



*Мал. 1.* Г. І. Шкуратава. Набожнік, вышыўка крыжыкам з элементамі гладзі. Пачатак XX ст.



*Мал. 2.* Г. І. Шкуратава. Кашуля, вышыўка крыжыкам. Пачатак XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Мал. 3.* Г. І. Шкуратава.
Набожнік, вышыўка гладдзю.
Першая палова XX ст.



*Мал. 4.* Г. І. Шкуратава.
Сурвэтка, вышыўка рышэлье.
Першая палова XX ст.


*1.* Голоса ушедших деревень: науч.-популярное изд. / Г. Г. Нечаева [и др.]. – Минск : Беларус. наука, 2008. – 342 с.

*2. Жук В. И.* Декоративно-прикладное искусство Беларуси XVIII–XX вв.: становление и тенденции развития / В. И. Жук ; Ин-т искусствовед., этнографии и фольклора. – Минск : [б. и.], 2004. – 47 с.


## ПРАБЛЕМА МАРАЛЬНАГА ВЫХАВАННЯ ЛЮБОВІ ДА МАЛОЙ РАДЗІМЫ Ў ПАДРАСТАЮЧАГА ПАКАЛЕННЯ ПРАЗ ПРАСТОРУ СУЧАСНАГА МУЗЕЯ


***В. І. Мазалеўскі,***
*старшы навуковы супрацоўнік*
*Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж»*


На сённяшні дзень праблема маральнага выхавання падрастаючага пакалення з’яўляецца адной з найбольш важных і актуальных у сучасным грамадстве.

Праблема мадэрнізацыі маральнага выхавання ў сістэме адукацыі звязана з выяўленнем і захаваннем назапашаных лепшых традыцый у выхаванні моладзі, абнаўленнем яго зместу, праектаваннем новых адукацыйных тэхналогій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ